традыцыі з выкарыстаннем лепшых сусветных дасягненняў. Проза Лукаша Калюгі і Юрыя Алешы яркае гэтаму пацверджанне.

Літаратура


1. **Афанасьева, А. С. Система мотивов в произведениях Ю. Олеши 20-х годов. / А. С. Афанасьева // Вестник Томского désinституту. Сер. История, филология. - 1997. - Вып. 1. - С. 40-47.**
2. **Бадиков, В. В. О стиле романа Ю. Олеши «Зависть» / В. В. Бадиков // Филологический сборник. - 1966. - Вып. 5. - С. 54-62.**
3. **Калюга, Л. Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты / Л. Калюга. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1992. - 607 с.**
4. **Лихачев, Д. С. Смех в Древней Руси / Д. С. Лихачев, А. М. Панченко. - Л.: Наука, Ленигр. отд-ние, 1984. - 295 с.**
5. **Олеша, Ю. К. Зависть. Рассказы. Ни дня без строчки / Ю. К. Олеша. - М.: Эксмо, 2008. - 608 с.**


## ПСІХАЛАГІЗМ У ТВОРЧАСЦІ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА НА ПРЫКЛАДЗЕ АПОВЕСЦІ «ЛЯВОН БУШМАР»


**Д. А. Казлова**
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,
Мінск, вул. Савецкая, 18, 220030, Рэспубліка Беларусь
e-mail: d.kozlova@yahoo.com



У артыкуле на прыкадзе аповесці «Лявон Бушмар» разглядаецца псіхалагізм, уласцівы творам Кузьмы Чорнага. У цэнтры твора — адмоўны персанаж, аднак аўтар выкрывае яго заганы не адразу. Толькі праз разумение адносін паміж галоўным героем і іншымі людзьмі чытач можа зразумець сутнасць «звярынай» натуры Лявона Бушмара. Таксама Кузьма Чорны разглядае псіхалагічны бок сацыяльнай праблемы ўласніцтва.



*Ключавыя словы.* псіхалагізм, Кузьма Чорны, уласніцтва, сістэма персанажаў.


## PSYHOLOGY IN THE WORKS OF KUZMA CHORNY ON THE EXAMPLE OF THE STORY «LIAVON BUSHMAR»


**D. A. Kazlova**
Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University,
Minsk, Sovetskaya Str. 18, 220030, Republic of Belarus
e-mail: d.kozlova@yahoo.com

Psychologism prose by Kuzma Chorny is considered in the article on the example of the story «Liavon Bushmar». The main character of the story is negative but the author doesn't show all his vices at the beginning of the story. The reader may understand Liavon Bushmar's brutal nature only by analyzing his relationship with other people. Kuzma Chorny also examines psychological aspect of the social problem of ownership.

*Key words*: psyhologism, Kuzma Chorny, ownership, system of characters.

Псіхалагізм з'яўляецца неад'емнай якасцю мастацкай літаратуры, гэта поўнае, глыбокае, падрабязнае выяўленне пры дапамозе сродкаў мастацкай літаратуры ўнутранага свету героя, яго думак, жаданняў эмоцый і перажыванняў.

У беларускай літаратуры адным з прадстаўнікоў псіхалагічнай прозы з'яўляецца Кузьма Чорны. У сваіх творах ён імкнуўся дастатова глыбока паказаць унутраны свет сваіх персанажаў праводзіў прычынна-следчыя сувязі паміж іх думкамі і дзеяннямі. У дадзеным артыкуле звернемся да аповесці «Лявон Бушмар», дзе, на нашу думку, пісьменнік дастаткова грунтоўна раскрывае характар галоўнага героя, звяртаецца да яго ўнутранага свету.

У дадзенай аповесці Кузьма Чорны выкрывае пачуццё нянавісці, якое чырвонай ніткай пранізвае ўвесь твор. Нянавісць вызначае не толькі адносіны паміж героямі, аднак і стаўленне аўтара да чалавека, атручанага ўласнымі заганамі.

Аб складаным характары Лявона Бушмара мы даведваемся літаральна з першых радкоў аповесці: *«Звераватую панурасцьЛявону Бушмару перадаў бацька»* [2, с. 13]. Гэтае ж параўнанне са зверам выкарыстоўваецца пісьменнікам напрацяіу ўсяго твора.

Увесь час пісьменнік паглыбляецца ў характар Лявона Бушмара пры дапамозе як унутранага, так і знешняга псіхалагічнага аналізу. Так, падцверджанне звераватай натуры галоўнага героя мы атрымліваем са слоў іншых персанажаў: *«Ты зусім, Бушмар, не калектыўны чалавек, — сказаў хтосьці з таварышчаў»* [2, с. 15]. *«Не калектыўшы ты чалавек. Звераваты. —Дзікі і нялюдскі»* [2, с. 16].

З самага пачатку твора можна заўважыць, што людзі ідуць з Бушмаром на кантакт. Аднак ён з-за сваёй звярынай натуры цалкам адбівае ў людзей жаданне мець з ім якія-небудзь адносіны. Яму ўтульней быць аднаму, нібы ваўку, каб ніхто не чапаў ні яго,

ні яго маёмасць: «*Бушмар правёў рукою па твары, як бы знімаючы з яго штосьці чужое і непрыемнае. Вочы яго ператварыліся ў агністыя стрэлкі. Ён зняў шапку, расшпіліў жакетку. Здавалася, што ён хоча гэтак пазбавіцца ўсяго лішняга, каб як мага глыбей чуць вялікую музыкуляснойадзіноты.*

*Бушмар стаяў. І от твар выцягнуўся, губы сціснуліся. Ноздры раздзьмуліся і заварушыліся. Так звер чуе магутны пах лесу, зямлі, вады, вясны, адзіноты. Такжа звер чуе і пах цёплай крыві. Вочы прыжмурыліся, бровы пацягнуліза сабоюўнізлоб*» [2, с. 19].

Пісьменнік паказвае чытачу істотную рысу Бушмара — адсутнасць звычкі думаць, разважаць. Тым самым Кузьма Чорны яшчэ раз падкрэслівае звераватую натуру галоўнага героя, зазначае, што ён, нібы жывёла, не мае ніякага ўнутранага жыцця — успамінаў мар. Ён жыве інстынктам, чым і губіць сам сябе.

Нягледзячы на складаную натуру Лявона, у яго ўсё ж узнікалі ўзаемаадносіны з жанчынамі. Першай перад намі паўстае Аміля, якая даглядала хворую маці Лявона Бушмара, а пасля смерці гаспадыні там і засталася на некаторы час.

Але нават з любай дзяўчынай галоўны герой не губляў сваёй панурасці: «*Яна глядзіць пакорліваў вочы яго. Усё роўна як просіць ласкі якой. Ён жа заўсёды адзін і той жа — пануры, маўклівы. Хто яго ведае, якія думкі варушаццаўяго віхрыстай галаве, пад гэтым навіслым чэрапам*» [2, с. 33].

Аміля ўвесь час імкнулася разварушыць Бушмара, абудзіць у ім чалавечыя пачуцці. Іншы раз гэта нават часткова атрымлівалася:

«*— Чаму ты гэтакі... Нейкі...*

*— Які?*

*— Не гаворыш ніколі са мною?*

*Яна не спускае з яго вачэй, і ён глядзіць доўга ў яе твар. Жанчына робіць цуд: на Бушмаравым твары з'яўляецца ласкавая мяккасць*» [2, с. 35].

Таксама можна прывесці яшчэ адзін прыклад «цуду», які адбываўся з Бушмаром дзякуючы Амілі: «*Аміля сілком пасадзіла яго каля сябе. Выплаквала свае слёзы доўга на плячы яго. І гэта зрабіла з Бушмарам цуд. Ён пачаў суцішаць яе, заспакойваць, прытульваў да сябе твар. Іусё стараўся скрывіць губыў ціхуюўсмешку*» [2, с. 42].

Аднак, на жаль, складанасць Бушмаравай натуры не дазволіла ім з Аміляй пабудаваць нейкае шчасце. Далей Лявону на жыццё-

вым шляху сустракаецца Галена, якая «*хутка разумецъ стала Бушмара. За кароткі час навучылася пазнавацъ усю звераватую постаць яго характару. Яна сэрцам познавала ўсю яго чалавечую урачыстасцъ і прыгнечанасцъ. I застаўшыся адна, яна адразу зразумела, што гаварыла Бушмарава маўклівасць на адвітанні і ссунутыя бровы*» [2, с. 68].

У аповесці «Лявон Бушмар» Кузьма Чорны звяртаецца да важнай на той час сацыяльнай праблемы ўласніцтва. Падчас таго, як савецкі народ будаваў калгасы, ствараў калектыўную ўласнасць, дастатова часта сустракаліся такія людзі, а можа і не зусім людзі, як Лявон Бушмар, якія звыкліся з ладам асабістага жыцця і, нібы зверы, абаранялі сваю ўласнасць.

У аповесці пісьменнік выкрывае «бушмараўшчыну», дэманструе антывобраз савецкага грамадзяніна. У пачатку твора аўтар дастаткова нейтральна ставіцца да свайго героя, імкнецца нейк растлумачыць яго звярыны лад жыцця, спасылаеца на тое, што натура дасталася яму ад бацькі і г. д.

Аднак чым больш раскрываецца ўнутраны свет галоўнага героя, тым больш мы заўважаем нянавісць пісьменніка да Бушмара. З кожнай старонкай аповесці ён становіцца ўсё больш антысацыяльным персанажам.

Такім чынам, Кузьма Чорны ў аповесці «Лявон Бушмар» закрануў важную на той час сацыяльную праблему ўласніцтва. На нашу думку, пісьменніку ўдалося дастаткова поўна і глыбока прааналізаваць псіхалогію і выкрыць усе негатыўныя бакі Лявона Бушмара.

## Литература


1. **Гинзбург, Л. Я. О психологической прозе / Л. Я. Гинзбург. - Л.: Современный писатель, Ленингр. отделение, 1971. - 464 с.**
2. **Чорны, К. Лявон Бушмар: аповесць, апавяданні: для ст. шк. узросту / Кузьма Чорны; прадм. М. Тычыны. - Мінск: Маст. Літ., 2007. - 198 с.**
3. **Матрунёнак, А. П. Псіхалагічны аналіз і станаўленне беларускага рамана / А. П. Матрунёнак. - Мінск: Навука і тэхніка, 1975. - 300 с.**
4. **Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапам. / В. Рагойша. - Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2001. - 384 с.**
5. **Тычына, М. Кузьма Чорны / М. А. Тычына. - 2-е выд., выпр. і дап. - Мінск: Беларус. навука, 2004. - 190 с.**